# Патушыць пажар і знайсці чалавека

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На базе Універсітэта грамадзянскай абароны МНС для прадстаўнікоў масмедыя падрыхтавалі некалькі інтэрактыўных пляцовак. Падзяліўшы нас на групы і замацаваўшы за кожнай па інструктары, якія суправаджаў экскурсантаў на ўсіх этапах, арганізатары пачалі выпрабоўваць журналістаў і блогераў на трываласць — прычым як фізічную, так і псіхалагічную.



## У задымленым пакоі

Спачатку мы пазнаёміліся з сучасным абмундзіраваннем супрацоўнікаў ведамства. Камплектаў вопраткі ў ратавальнікаў некалькі — кожны прызначаны для выкання пэўных задач. Удалося прымераць баявы касцюм, які ратавальнікі апранаюць, калі выязджаюць на ліквідацыю ўзгарання. Для мяне ён паказаўся цяжкім — яно і не дзіва: не на мой памер сшыты. У такім касцюме не тое што тушыць пажар — рухацца складана. А касцюм, між іншым, ва ўмовах трывогі апранаецца за 18 секундаў. Прычым поўнае абмундзіраванне (з балонам і іншым абсталяваннем, патрэбным пажарнаму) важыць не менш як дзесяць кілаграмаў. Гэта пры ўмове, што апарат сціснутага паветра на ратавальніку — аблегчанага варыянта (да 4 кілаграмаў). Але нярэдка на супрацоўніку ведамства балон вагой у амаль 16 кілаграмаў. Вядома, пра цяжар і нязручнасці ратавальнікам няма калі разважаць: у момант надзвычайнай сітуацыі яны думаюць толькі аб адным — выцягнуць чалавека з агню жывым.

Дарэчы, апынуцца ў задымленым памяшканні, дзе яшчэ і нічога не відаць, а цемру пранізваюць крыкі і стогны людзей, якія трапілі ў бяду, — таксама выпрабаванне не для слабанервовых. Аднак такіх, на шчасце, у Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях няма. Мне, журналісту, прызнацца, было страшнавата аказацца ў такой абстаноўцы, хоць яна і была нерэальная. Аднак спецэфекты робяць карціну набліжанай да рэальнай. У такіх умовах вучацца будучыя ратавальнікі.

— Дымакамера прызначана для таго, каб падрыхтаваць ратавальнікаў для работы ў экстрэмальных умовах, — тлумачыць **афіцыйны прадстаўнік Універсітэта грамадзянскай абароны МНС Андрэй САДОЎСКІ.** — Тым самым мы трэніруем нашых ратавальнікаў для работы ў непрыдатным для дыхання асяроддзі — для таго каб на рэальных пажарах яны ведалі, што ім рабіць, і не баяліся. Гэта адзін з элементаў і псіхалагічнай падрыхтоўкі.

## Чатырохногія героі аперацыі ў Турцыі

Наогул ратавальнікі гатовыя да самых розных надзвычайных сітуацый. У многіх здарэннях, дарэчы, ёсць сезоннасць. У лесе людзі губляюцца, як правіла, летам і восенню — калі ідуць у ягады ды ў грыбы. Выявіць пацярпелых у лясным гушчары супрацоўнікам МНС дапамагае самая сучасная тэхніка. Рэгулярна ў такіх выпадках выкарыстоўваюцца беспілотныя лятальныя апараты. Дабрацца ў цяжкадаступныя месцы дапамагае ўсюдыход «Шэрп», які на бездарожжы як рыба ў вадзе: ён з лёгкасцю пераадольвае і снег, і лёд, і буралом, і балота, нават пераплывае вадаёмы.

У пошуку людзей у лесе ды і не толькі ратавальнікам дапамагаюць сабакі. Без іх звышздольнасцяў нават прафесіяналам справіцца складана. І гэта пацвердзілі пошукавыя работы па ліквідацыі наступстваў землятрусу ў Турцыі.

Знаёмімся з чатырохногімі героямі выратавальнай аперацыі. Лабрадоры Дарк і Тая — тыя з пяці сабак, якія разам з ратавальнікамі Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння «ЗУБР» лятали ў Турцыю.

«Яны ўказвалі кірунак, дзе знаходзіліся жывыя людзі, пасля чаго з дапамогай спецыяльнага абсталявання мы прыступалі да работы, — расказвае **кінолаг атрада Сяргей ЯЗІНСКІ.** — У першыя дні работа ішла вельмі добра, у наступныя сабакам перашкаджаў трупны пах. Мы адчуваем яго, а сабакі тым больш: яны больш адчувальныя, чым людзі. Такога прыбора яшчэ не знайшлі, каб замяніць нос сабакі».

Удзельнікі пошукавай аперацыі ў Турцыі расказалі, што беларускіх сабак «разрывалі на часткі». «Многія хацелі, каб яны папрацавалі і на іх пошукавым участку, — згадвае **ратавальнік Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння «ЗУБР» Віталь АРЛОЎ.** — Некаторыя нават хітрылі: казалі, што быццам бы пад заваламі чуюць голас чалавека. Аднак нашых сабак не падманеш: яны рэагавалі толькі на жывых людзей».

Што датычыцца нашай краіны, кінолагі атрада разам са сваімі гадаванцамі шукаюць людзей, якія згубіліся, па ўсёй тэрыторыі Беларусі — выязджаюць у самы кароткі час. Дарэчы, у цяжкадаступныя месцы сабака дэсантуецца беспарашутным спосабам разам з кінолагам. На балансе падраздзялення — чатыры пароды сабак: лабрадоры, нямецкія аўчаркі, бельгійскія аўчаркі і бельгійскія пойнтары.

## Чырвоная «хуткая»

Паспрабавалі журналісты і дэблакіраваць пацярпелага ва ўмоўным дарожна-транспартным здарэнні. Быццам паперу, рэзалі жалеза спецыяльнымі нажніцамі, пры дапамозе іншага абсталявання спрабавалі выцягнуць «пацярпелага» з машыны. Паводле легенды арганізатараў, ён быў без прытомнасці. На той момант жыццё чалавека, хай умоўнага, знаходзілася ў руках журналістаў. Правільна аказаць першую медыцынскую дапамогу — ён будзе жыць, разгубімся або будзем панікаваць ці рабіць рэанімацыйныя мерапрыемствы няправільна — страцім чалавека.



Дарэчы, на здарэнні, дзе ёсць пацярпелыя, ратавальнікі выязджаюць са сваімі медыкамі. На балансе МНС знаходзяцца аўтамабілі медыцынскай службы — тая ж хуткая дапамога, толькі не белага, а чырвонага колеру.

— Наша хуткая дапамога абсталявана па класе рэанімабіля, — расказвае **ўрач хуткай медыцынскай дапамогі Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння «ЗУБР» Віктар ЛІТВІН.** — Тут ёсць усё неабходнае: дэфібрылятар з кардыяманіторам, апарат штучнай вентыляцыі лёгкіх, кардыёграф, шыны, насілкі і іншае. Мы не выязджаем на звычайныя выклікі — толькі разам з ратавальнікамі на месцы надзвычайных сітуацый. Таксама займаемся навучаннем супрацоўнікаў МНС навыкам першай медыцынскай дапамогі.

Падчас семінара журналісты даведаліся і пра асаблівасці работы ратавальнікаў на вышыні, паназіралі за спаборніцтвамі прадстаўнікоў зборнай каманды па пажарна-выратавальным спорце, азнаёміліся з асноўнымі ўзорамі аварыйна-выратавальнай і спецыяльнай тэхнікі, якая стаіць на ўзбраенні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Адным словам, семінар адкрыў перад журналісцкай супольнасцю ўсе тонкасці прафесіі ратавальніка, дазволіў хоць бы на кароткі перыяд адчуць сябе ў ролі прафесіянала, які нясе адказнасць не толькі за сябе і сваіх калег, а і за жыццё людзей.

— Мы аналізавалі наша ўзаемадзеянне са сродкамі масавай інфармацыі, глядзелі, якім чынам сёння асвятляецца не проста дзейнасць Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, а ў цэлым роля дзяржавы па абароне людзей ад надзвычайных сітуацый, — кажучы аб мэтах семінара для СМІ, адзначыў **афіцыйны прадстаўнік МНС Яўген БАРАНОЎСКІ.** — Зыходзячы з гэтага, мы зрабілі выснову, што ёсць пэўныя нюансы недагаворанасці. Падчас семінара мы расказалі, што дзейнасць нашага ведамства не зводзіцца толькі да ратавання людзей пры шматлікіх здарэннях. Гэта вялікая работа: пачынаючы ад фарміравання культуры бяспекі і заканчваючы дапамогай нашым грамадзянам, якія трапілі ў бяду.



**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота Уладзіміра ШУБЫ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Мінабароны РФ: УС Расіі сарвалі спробу ўварвання ўкраінскіх баевікоў у Белгародскую вобласць



Тэлеграм-канал Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі ўчора паведаміў пра тое, што ў ноч на чацвер, «пасля інтэнсіўнага абстрэлу грамадзянскіх аб'ектаў у Белгародскай вобласці, украінскія тэрарыстычныя фарміраванні сіламі да дзвюх мотапяхотных рот, узмоцненых танкамі, распачалі спробу ўварвання на тэрыторыю Расійскай Федэрацыі ў раёне населенага пункта Новая Тавалжанка і міжнароднага аўтамабільнага пункта пропуску «Шабекіна». Актыўныя дзеянні расійскіх вайскоўцаў дазволілі адкінуць праціўніка, парушэнні дзяржграніцы не дапушчаны», рэзюмавала міністэрства.

Губернатар Белгародскай вобласці Уладзіслаў Гладкоў расказаў пра восем параненых жыхароў Шабекіна ў выніку начных абстрэлаў з боку Узброеных сіл Украіны. Напярэдадні з Шабекінскай акругі пачалі арганізаваны вываз дзяцей і сямей з малымі дзецьмі ў іншыя расійскія рэгіёны. Для жыхароў Шабекінскай акругі падрыхтаваны пункты часовага размяшчэння ў сталіцы рэгіёна.

### Еўрапарламент ухваліў рэзалюцыю супраць старшынства Будапешта ў ЕС



Рэзалюцыя, якая патрабуе ад Савета ЕС не даць Венгрыі прыняць старшынства ў 2024 годзе з-за «невыканання законаў і каштоўнасцяў ЕС», носіць рэкамендацыйны характар. «Парламент падкрэслівае важную ролю старшынства ў Савеце ў прасоўванні заканадаўства, забеспячэнні пераемнасці парадку дня ЕС і прадстаўленні Савета ў адносінах з іншымі інстытутамі. Узнікае пытанне, як Венгрыя зможа надзейна выканаць гэту задачу ў 2024 годзе, улічваючы невыкананне ёю законаў і каштоўнасцяў ЕС, а таксама прынцыпу шчырага супрацоўніцтва. Таму Еўрапарламент просіць Савет знайсці належнае рашэнне і нагадвае, што можа прыняць адпаведныя меры, калі такое рашэнне не будзе знойдзена», — адзначаецца ў дакуменце.

### У ніжняй палаце Кангрэса ЗША прыняты закон аб павышэнні мяжы дзярждоўгу



Ініцыятыва прадугледжвае павышэнне мяжы дзярждоўгу да студзеня 2025 года ў абмен на правядзенне прапанаваных Рэспубліканскай партыяй рэформ. Сярод іншага яны ўключаюць пераразмеркаванне сродкаў, выдзеленых на надзвычайную дапамогу пры пандэміі COVID-19, а таксама перамеркаванне часткі фінансавання Службы ўнутраных даходаў ЗША.

Як папярэдзіла раней кіраўнік амерыканскага мінфіна Джанет Елен, адміністрацыя можа вычарпаць надзвычайныя меры ў сувязі з дасягненнем максімуму дзярждоўгу ўжо 5 чэрвеня. У такім выпадку, як неаднаразова падкрэслівалася, краіна сутыкнецца з дэфолтам, які прывядзе да «эканамічнай катастрофы» ў самой краіне і выкліча ўзрушэнні ў сусветнай эканоміцы.